# У мінулую суботу ў Гомельскім раёне адбыўся першы фальклорна-экалагічны фестываль “Грабаўская вяснянка”



**“Агу, вясна, агу, красна, а што ты нам прынесла?” – такія песні-заклічкі на розныя матывы гучалі ў мінулую суботу ў Гомельскім раёне: тут адбыўся першы фальклорна-экалагічны фестываль “Грабаўская вяснянка”, прымеркаваны да Году народнага адзінства.**

Як зазначыла старшыня мясцовага сельвыканкама Наталля Кісялёва, адна з арганізатараў фестывалю, свята “Гуканне вясны” бытавала пераважна на Гомельшчыне, а ў Грабаўцы і

навакольных вёсках абрадавыя дзеянні, хоць і мелі аднолькавы сэнс, усё ж адрозніваліся.

*— Таму і вырашылі паказаць усю прывабнасць гэтай народнай традыцыі,* — адзначыла Наталля Вадзімаўна. — *Акрамя таго, Грабаўка вядома помнікам прыроды — тут захаваліся рэшткі панскай сядзібы, а ў школе шмат увагі надаецца экалагічнаму выхаванню вучняў.*

Традыцыйна гуканне вясны — справа жаночая, таму перад гасцямі фестывалю выступілі вучні ўстаноў адукацыі з Грабаўкі і Маркавіч, творчы калектыў выхавацеляў Пясочнабудскага ясляў-сада і аматарскае аб'яднанне "Сустрэча" Пясочнабудскай сельскай бібліятэкі. Яны прадставілі абрады заклікаў вясны, што бытавалі ў іх мясцовасці. Грабаўскія дзяўчынкі выклікалі захапленне прыгожым танцам-карагодам, а жанчыны з Пясочнай Буды прадэманстравалі, якія спевы бытавалі на іх малой радзіме.





А вось як праводзілі абрад гукання вясны ў Маркавічах.

*— У нас «вяснянкі» пачыналі спяваць толькі на Благавешчанне, якое адзначаецца 7 красавіка. Гэта — вялікае хрысціянскае свята, падчас яго забаранялася любая работа. Казалі, што ў гэты дзень «пціца гняздо не ўе, дзеўка косу не пляце», —* расказаў адзін з арганізатараў фестывалю, ураджэнец Маркавіч Віктар Шыпкоў. — *Жанчыны, дзяўчаты і дзеці ў гэты дзень беглі ў дуброву (зараз гэтае месца называецца Дуброўкі), заводзілі танок (танец-карагод) і пачыналі пець “вяснянкі”, клікаць птушак, абуджаць зямлю ад зімовага сну.*





Адну з такіх аўтэнтычных вяснянак і праспявалі дзяўчынкі з Маркавіч:

*Зімавалі, не спявалі, вясну дажыдалі.*

*Вясна, вясна, мая вясна,*

*А што ж ты нам дый прынесла?*

*Старым бабам па кіёчку,*

*А дзевачкам па вяночку: гу-у-у!*

Нямала ўвагі прыцягнулі выставы Грабаўскага дзіцячага сада – сярэдняй школы – музея водараў і шпакоўняў, якія зрабілі вучні.

– *Фальклорна-экалагічны фестываль "Грабаўская вяснянка" паказаў багацейшы пласт народнай культуры малой радзімы, таму з нецярпеннем будзем чакаць працягу*, – зазначылі госці і ўдзельнікі свята народнай творчасці. – *Нам ёсць што пераняць ад нашых продкаў і захаваць для нашчадкаў.*

Ірына ГРАМЫКА.

https://sozhnews.by